# ПРАБЛЕМА ЭКЗІСТЭНЦЫЙНАГА ВЫБАРУ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРАЎ ЯНКІ БРЫЛЯ І ВАСІЛЯ БЫКАВА)

# ПРОБЛЕМА ЭКЗИСТЕНЦИАЛЬНОГО ВЫБОРА В БЕЛОРУССКОЙ ЛИТЕРАТУРЕ (НА МАТЕРИАЛЕ ПРОИЗВЕДЕНИЙ ЯНКИ БРЫЛЯ И ВАСИЛЯ БЫКОВА)

# THE PROBLEM OF EXISTENTIAL CHOICE IN BELARUSIAN LITERATURE (BASED ON THE MATERIALS OF THE WORKS OF YANKA BRILL AND VASYL BYKAV)

***В.А. Вараб'ёва***

***О.А. Воробьёва***

***V. Varabyova***

Белорусский государственный университет,
Минск, Республика Беларусь, *VorobOA@bsu.by*
Белорусский государственный университет,
Минск, Беларусь, *VorobOA@bsu.by*
Belarusian State University,
Minsk, Republic of Belarus, *VorobOA@bsu.by*

У артыкуле вызначаецца катэгорыя экзістэнцыйнага выбару. Экзістэнцыйны выбар разглядаецца ў беларускай мастацкай прозе на матэрыяле твораў Янкі Брыля і Васіля Быкава. Сцвярджаецца маральная дамінанта ў выбары жыццёвага шляху чалавека.

*Ключавыя словы:* экзістэнцыйны выбар; Вялікая Айчынная вайна, Янка Брыль, Васіль Быкаў.

В статье определяется категория экзистенциального выбора. Экзистенциальный выбор рассматривается в белорусской художественной литературе на материале произведений Янки Брыля и Василия Быкова. Утверждается нравственная доминанта в выборе жизненного пути человека.

*Ключевые слова:* экзистенциальный выбор; Великая Отечественная война, Янка Брыль, Василь Быков.

The article defines the category of existential choice. Existential choice is considered in Belarusian fiction based on the works of Yanka Bryl and Vasyl Bykav. The moral dominant in the choice of a person's life path is asserted.

*Keywords:* existential choice; The Great Patriotic War, Yanka Bryl, Vasyl Bykau.

Пытанні сэнсу жыцця цікавілі чалавека ва ўсе часы. Дастаткова ўзгадаць міфалагічных персанажаў Гільгамеша, Ікара, Ясона, Праметэя, Антыгоны. Пошукі сэнсу жыцця – гэта праграма чалавечага існавання,

выбар каштоўнасцей і прыярытэтаў, на якія абапіраецца чалавек у рэалізацыі магістральнай лініі ўласнага шляху. Каштоўнасці і прыярытэты не з'яўляюцца нязменным аднойчы выбраным арыенцірам, яны вызначаюцца ўзроўнем духоўнага развіцця асобы, які фарміруе маральную адказнасць і сумленне. Працэс жыцця пастаянна ставіць чалавека ў сітуацыі выбару – неабходнасці рэагавання на знешнія абставіны адпаведна сваім прыярытэтам. Выбар, які звязаны з неабходнасцю перагляду каштоўнасцей і ідэалаў, можна назваць экзістэнцыйным.

Як заўважае А.П. Мерсіянава, «ў сучасным разуменні з экзістэнцыйным выбарам чалавек сустракаецца не толькі ў аб'ектыўна надзвычайных сітуацыях («пагранічныя сітуацыі» К. Ясперса), гаворка ідзе аб зменах жыццёвых пазіцый, пераломнасці жыццёвага шляху, канстытуяванні ўласнага жыцця” [1]. Пры гэтым «чалавек свабодны ў сваім выбары: ён сам вызначае, якую альтэрнатыву адхіліць, якога сябе неабходна «знішчыць», а якому сабе даць магчымасць «нарадзіцца» [1]. Экзістэнцыйны выбар – гэта каштоўнасны выбар чалавека, выбар маральных прыярытэтаў, якія адпавядаюць духоўнаму развіццю чалавека, яго жыццёвым прынцыпам. Таму можна сказаць, што экзістэнцыйны выбар не залежыць ад абставін і ўмоў жыцця, сацыяльнага статусу, грамадска-палітычнага ладу, якія выступаюць толькі ў якасці знешніх раздражняльнікаў сітуацыі і патрабуюць ад чалавека хуткай рэакцыі-адказу – самастойнага выбару. Пры гэтым чалавек можа як каардынальна змяніць свае погляды, выбраць новы, альтэрнатыўны, шлях, так і застацца са сваімі ранейшымі перакананнямі. У любым выпадку сітуацыя экзістэнцыйнага выбару – гэта сітуацыя “мяжы”, “краю” ў самім чалавеку, сітуацыя “альбо-альбо”; гэта выбар, якога нельга не зрабіць.

Пытанні экзістэнцыйнага выбару знаходзяцца сёння ў полі зроку навукоўцаў розных галін ведаў: псіхолагаў, гісторыкаў, фалькларыстаў, этнографаў, філолагаў-літаратуразнаўцаў, мастацтвазнаўцаў і інш.

У беларускай літаратуры праблема экзістэнцыйнага выбару можа разглядацца на прыкладзе твораў як розных жанраў, так і рознай тэматыкі. Праблема выразна адлюстравана ў беларускай прозе на тэму Вялікай Айчыннай вайны, якой адводзіцца асаблівае месца. У Беларусі загінуў кожны трэці жыхар. Кожная сям'я панесла страты. І кожны беларус так ці інакш ацэньвае ваенныя падзеі, імкнучыся спасцігнуць іх сэнс. Ваенныя падзеі ў мастацкіх творах перадаюцца па-рознаму: у рэальным часе, як успаміны, сны, трызненне. І кожны раз перад чытачом з'яўляецца новы герой, чалавек са сваім характарам, настроем, ладам жыцця, які трапляе ў складаную сітуацыю і вымушаны рабіць выбар.

Невялікае апавяданне Янкі Брыля “Memento mori” апісвае адну з трагічных ваенных падзей: жыхароў вёскі зганяюць у хлеў, каб спаліць. Адзін з катаў заўважае печніка, які клаў яму печ, і ён вырашае вызваліць яго. Аднак пячнік адмаўляецца. Ён застаецца разам са сваімі вяскоўцамі.

*“– Спадар зондэрфюрэр пачынае злавацъ. Вы, дзядзька, не дурыцеся, калі хочаце жыць. Зараз адрыну падпаляць. Ён кажа, што вы, мусіць, хацелі б забраць адтуль усю банду.*

*Пад чорнай навіссю броваў ажылі нарэшце вочы. Губы зусім перасталі дрыжаць. Нібыта не сваю, незвычайным жэстам, пячнік узняў галаву:*

*– А ён што думаў? І ўсіх! Усіх добрых людзей!.. Можа, ён ім раўня – гэты твой гаспадар? Або ты, можа?.. Цьфу!..*

*Чалавек плюнуў пад ногі, тады павярнуўся і ўжо не тым няпэўным крокам, як сюды, пайшоў да варот адрыны...І ён згарэў – адзін, хто мог бы ў той дзень не згарэць...”* [2].

Сёння, калі мы пераглядаем каштоўнасці, шукаем і знаходзім новыя адценні ўчынкаў, даем сабе права іх пераацэньваць, узнікае пытанне: можа варта было вырагаваць сваё жыццё, жыццё жонкі, дачкі, ўнукаў? Аднак такое кампраміснае рашэнне не ўлічвае ні абставін, ні эмацыйнай сферы, ні праўды жыцця. Ва ўмовах жорсткага процістаяння кампраміс немагчымы. Кампраміс прадугледжвае выбар “трэцяга” шляху, “сярэдзіннага”. А ў вайны яго няма. Пячнік гэта адчуваў. Ён ведаў, што, пагадзіўшыся на жыццё, ён пагаджаецца на служэнне нацыстам, на здраду свайму народу, а найперш – на здраду сабе. І ён прыняў рашэнне, адзіна магчымае для сябе. Гэты ціхмяны сціплы чалавек застаўся сабой да канца, ён кіраваўся сваім сумленнем і ўнутранымі крытэрыямі чалавечнасці, справядлівасці, вернасці, чэснасці, без якіх фізічнае існаванне для яго страчвала сэнс.

Высокія маральныя прынцыпы чалавечай годнасці праяўляюць і героі твораў Васіля Быкава: Сотнікаў з аднайменнай аповесці і настаўнік Алесь Мароз з яго аповесці “Абеліск”.

Па-рознаму складваюцца лёсы герояў. Кожны з іх ідзе да сябе сваім шляхам, пакрысе спасцігаючы сэнс жыцця. Так, Сотнікаў, разважаючы над сваім жыццём, аналізуючы яго, прыходзіць да высновы, што “*ёсць жа на свеце штосьці непамерна важнейшае за сваю шкуру”* [3]. Адчуваючы ўласную віну за тое, што з-за яго будуць пакараны іншыя людзі, якія не данеслі (стараста Пётра) ці хавалі яго на гарышчы (Дзёмчыха), Сотнікаў спрабуе дапамагчы ім выратавацца: *“Сабе ён ужо нічым не мог памагчы, але, мабыць, ён мог яшчэ нешта зрабіць для іншых. І Сотнікаў проста і лёгка, як штосьці элементарнае і зусім лагічнае ў яго становішчы, прыняў апошняе цяпер рашэнне: узяць усё на сябе.*

*Заўтра ён скажа следчаму, што хадзіў у разведку, меў пэўнае баявое заданне, у перастрэлцы раніў паліцая, што ён – камандзір Чырвонай Арміі і ненавідзіць фашызм – хай расстраляюць яго. Астатнія тут ні пры чым”* [3]. Скатаваны, фізічна знясілены, з пераламанымі пальцамі, з павыдзіранымі пазногцямі, прастрэленай нагой, ён быў спакойны, бо адчуваў сваю сілу, большую, чым зброя і катаванні — упэўненасць у сваёй праўдзе і, як вынік, адсутнасць страху: *“У бобікаў зброя, сіла, але ў яго таксама ёсць на чым пастаяць у канцы. Ён іх не баяўся”* [3].

У ноч перад павешаннем Сотнікаў па-іншаму паглядзеў на людзей, з якімі яго звёў лёс у апошнія дні жыцця: яму было прыкра і агідна слухаць Рыбака, які любой цаной хацеў выжыць; сорамна было перад старастам Пётрам, якога хацеў забіць як здрадніка і прыстасаванца, а той аказаўся па-народнаму мудрым і спагадлівым, цэльным і надзейным чалавекам, які і тады не данёс на іх, і зараз, перад тварам смерці, не збіраўся прыстасоўвацца:

“*–Заставлялі, каб выведаў ад вас. Пра атрад, ну і яшчэ некаторае.*

*– Во як! – здзівіўся Рыбак і непрыемна паморшчыўся, успомніўшы, як яны нядаўна размаўлялі з Сотнікавым. – Шпіёніць, значыць?*

*— Ну, бытта. Шэсцьдзесят сем год пражыў, а пад старасць на такое дзела... Не-е, не па мне гэта”* [3].

Апошнія словы Пётры можна лічыць яго базавай жыццёвай праграмай, яго выбарам – нельга паскудзіць сваю душу перад самім сабой. Самы галоўны суддзя – ты сам. Нават прыняўшы прапанову быць старастам, Пётра не здрадзіў сабе: ён ні на кога не заявіў, нікога не знявечыў, дапамагаў партызанам. Ён разумеў, што ходзіць па “краю”, і гэты “край” некалі скончыцца. І ён скончыўся. Заўтра Пётру павесяць.

Быў шчырым перад сабой і сваім сумленнем герой аповесці “Абеліск” Алесь Мароз. Хоць далёка не ўсе – калегі, начальства, вяскоўцы – разумелі і апраўдвалі яго ўчынкі. І тады, перад вайной, калі Мароз толькі пачаў працаваць у школе Сяльца, сумняваліся ў яго педагагічных здольнасцях. Ставілі на від, што праграму ён не выконваў, што паводзіў сябе не як настаўнік-інтэлігент: сам пілаваў дровы, даводзіў да дому малодшых вучняў. Асудзілі, што ў час вайны на акупіраванай тэрыторыі ён не спыніў сваёй працы: працягваў вучыць дзяцей, гэта значыць, стаў нямецкім настаўнікам.

Але Мароз ведаў, што ён павінен вучыць і выхоўваць дзяцей у любых умовах, і ён вучыў. Сваіх вучняў, аднак, Мароз не ўратаваў: іх арыштавалі за спробу забіць паліцаяў. І тады Адесь Іванавіч Мароз насуперак логіцы і здароваму сэнсу сам здаўся немцам, ведаючы, што хлопцам гэта не дапаможа, іх усё роўна расстраляюць ці павесяць, а цяпер і яго разам з імі. Але Мароз лічыў, што абавязаны быць разам са

сваімі вучнямі, падтрымліваць іх і, калі ўдасца, дапамагчы. Удалося ўратавацца толькі аднаму – Паўлу Міклашэвічу, які працягнуў справу Мароза – стаў настаўнікам, і дабіўся, каб Мароз быў вернуты з забыцця, а яго прозвішча было ўпісана ў таблічку на невялікім абеліску побач з прозвішчамі яго выхаванцаў.

Для Паўла Міклашэвіча вяртанне імені свайму настаўніку стала справай жыцця, перамогай дабра і справядлівасці. Сімвалічна, што завяршыўшы гэту справу, Міклашэвіч памірае. Пенсіянер Цімафей Цітавіч Ткачук, сябра Мароза, былы загадчык РАНА, а пасля вайны настаўнік школы ў Сяльцы, на пахаванні Паўла Міклашэвіча заўважае: "*Мароз быў нашым болем. На сумленні ў абодвух. У мяне і ў яго, Міклашэвіча...Я здаўся. А ён не. І перамог. Дабіўся свайго. Шкада, сам не вытрываў*" [4]. "*Так ужо заведзена. За ўсё добрае трэба плаціць. І часам дарагой цаной*", – з горыччу гаворыць Ткачук [4]. Аднак пасеенае добрае зерне абавязкова прарасце. Усё той жа Ткачук заўважаў, што Міклашэвіч стаў падобным на Мароза "*характарам, дабрынёй, прынцыповасцю*" [4]. І пасля Міклашэвіча жывое зерне абавязкова застанецца жыць, "*не можа не застацца. Такое не прападае. Прарастае. Праз год, пяць, дзесяць, а што-небудзь праклюнецца*" [4]. Той вялікі духоўны скарб, які меў Мароз, падхапіў і перадаў наступным пакаленням Міклашэвіч; і гэта "*цудоўная пераемнасць*" не павінна спыніцца. І не спыніцца, пакуль у ацэнцы дзеянняў чалавека будзе дамінаваць духоўны крытэрый. Гэта пазіцыя аўтара, укладзеная ў вусны Ткачука: "*Забіў немца ці не забіў?.. Ён зрабіў больш, чым калі б забіў сто. Ён жыццё палажыў на плаху. Сам. Дабраахвотна. Вы разумееце, які гэта аргумент? І на чыю карысць...*" [4]. Мароз і Міклашэвіч – гэта прыклад яшчэ аднаго шляху, шляху духоўнага служэння, накіраванага на будучае.

Кожны чалавек ідзе сваім шляхам, кожны робіць свой выбар, яны розныя, аднак усе іх аб'ядноўвае усведамленне духоўнай цэльнасці асобы, разуменне, што напалову чалавекам быць нельга, а каб застацца чалавекам, трэба захоўваць годнасць, а не жыццё.

У гэтым сэнсе паказальны вобраз Рыбака з аповесці Быкава "Сотнікаў". Ён, моцны фізічна, па-вясковаму спрактыкаваны, аказваецца слабым духоўна. Пра гэта сведчыць і яго выбар. Рыбак баіцца смерці і выбірае жыццё: *"Рыбак хоць і адчуваў, нібы ён у чымсь правініўся, стараўся пераканаць сябе, што вялікай віны ў яго няма. Вінаваты той, хто нешта робіць для выгоды сабе ці па сваёй злой волі для іншых, а ў яго хіба выгода? Проста ён меў болей магчымасцяў і схітрыў, каб выжыць. Але ён не здраднік. Ва ўсякім разе, служыць ворагам ён не збіраўся. Ён усё чакаў, каб падпільнаваць зручны момант,*

*можа, цяпер, а можа, трошкі пазней, – і толькі яны яго ўбачаць”* [3]. Спадзяванні на ўцёкі аказаліся марнымі. Жыццё не дало яму другога шансу. Памылковасць такога выбару ён зразумеў вельмі хутка: "*І яго нібы абухом па галаве аглушыла нечаканае разуменне, што ўцякаць яму няма куды. Пасля гэтае ліквідацыі – няма куды. З гэтага строю дарогі да ўцёкаў няма”* [3]. І толькі цяпер прыйшло разуменне, што ён памыліўся, калі выбраў кампраміс, ён нікога не перахітрыў, ён здрадзіў: “*Усё ўвачавідкі рушылася, гінула, здабытае цаной такіх намаганняў у барацьбе за самае дарагое – жыццё. І на чорта яму цяпер тое жыццё? Каб служыць немцам?”* [3]. Спроба самагубства не ўдалася. І ён стаў служыць немцам.

Жудасная карціна мнімага патрыятызму паўстае ў адным з апошніх твораў В. Быкава – аповесці “Балота”: вясковага хлопца-пастушка Косцю, які правёў групу дэсантнікаў да вызначанага месца, камандзір Гусакоў аддаў загад застрэліць, каб той нікому пра іх не змог расказаць. Жыццё хлопчыка-падлетка Гусакоў спачатку называе “*невялічкай балючай праблемай*”, а крыху паразважаўшы, і ўвогуле абясцэньвае: “*Але, можа, гэта толькі здаецца – праблема? Увогуле, – якая праблема? На акупаванай тэрыторыі. Аднаго чалавека. Хоць бы і хлопчыка. Немцы іх вунь колькі нішчаць кожнага дня – і хлопчыкаў, і дзяўчынак. Шкада, канешне, але ж бяспека партызанскага злучэньня важней”* [5]. Ілжывае самаапраўданне, якое ператварае чалавека ў нелюдзя. Вяртанне ў чалавечае аблічча пасля такой здрады можа стаць магчымым толькі пры ўмове асэнсавання і прызнання віны, а таксама вялікай духоўнай працы па ачышчэнню свайго сумлення. Аднак для гэтага патрэбен як мінімум пэўны тэрмін, перыяд часу, а яго ў чалавека можа і не быць. Аповесць Быкава – прытча з адкрытым фіналам. Быкаў пакідае жывым старшыню Агрызкава, які адмовіўся выконваць загад Гусакова. Мы не ведаем, ці застаўся жывым фельчар, які не стаў забіваць хлопца і адпусціў яго, ці здолеў вярнуцца жывым у сваю вёску Косця. А Гусакова застрэлілі, выпадкова ў канцы твора “свае”, тыя партызаны, да якіх група прабівалася – люстра сітуацыі з падлеткам. Хлопчык Косця таксама павінен быў загінуць ад рук “сваіх”, а яго смерць была б прылічана да ахвяр вайны.

Вайной можна прыкрыць і апраўдаць многія страхі, слабасці чалавека, яго памылкі, сумненні, адчай – гэта вялікае выпрабаванне сілы і годнасці чалавека, якое кожны праходзіць па-своему, бо кожны выбірае свой шлях. Гэты шлях і ёсць экзістэнцыйны, таму што ён маркіруе жыццё чалавека знакам якасці ці кляймом. Таму важна зрабіць такі выбар, стаць на такі шлях, які дазволіць зберагчы ў сабе чалавека.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. *Мерсиянова А.П.* Основные признаки экзистенциального выбора // Вестник ТГУ: педагогика и психология. 2010. № 335. С. 153–156.

2. *Брыль Я.* Memento mori [Электронный ресурс]. URL: https://library.by/portalus/modules/belprose/readme.php?subaction=showfull&id=1096208426&archive=&start_from=&ucat=& (дата обращения 03.11.2023).
3. *Быкаў В.* Сотнікаў [Электронный ресурс]. URL: https://knihi.com/Vasil_Bykau/Sotnikau.html (дата обращения 03.11.2023).
4. *Быкаў В.* Абеліск [Электронный ресурс]. URL: https://knihi.com/Vasil_Bykau/Obielisk-rus.html (дата обращения 03.11.2023).
5. *Быкаў В.* Балота [Электронный ресурс]. URL: https://knihi.com/Vasil_Bykau/Balota.html (дата обращения 03.11.2023).

# ПРОЕКТ «КНИГА ПАМЯТИ» КАК ЭЛЕМЕНТ ПАТРИОТИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ МОЛОДЕЖИ

# PROJECT ‘BOOK OF MEMORY’ AS AN ELEMENT OF PATRIOTIC EDUCATION OF YOUTH

***С.А. Давыдова***

***S.A. Davydova***

Белорусский государственный университет,
Минск, Беларусь, *DavydovaSA@bsu.by*
Belarusian State University,
Minsk, Belarus, *DavydovaSA@bsu.by*

В статье рассматриваются вопросы воспитания гражданственности и патриотизма у молодежи. В статье также описывается проект «Книга Памяти», созданный студентами и преподавателями БГУ.

*Ключевые слова:* гражданственность; патриотизм; патриотическое воспитание; проект «Книга Памяти».

The article discusses issues of education of citizenship and patriotism among young people. The article also describes the project ‘Book of Memory’, created by students and teachers of BSU.

*Keywords:* citizenship; patriotism; patriotic education; project ‘Book of Memory’.

В современных условиях, когда происходят глубочайшие изменения в жизни общества, идея воспитания патриотизма и гражданственности приобретает все большее общественное значение, становится задачей государственной важности, одним из центральных направлений работы с молодежью. Сейчас, в период нестабильности в обществе, возникает необходимость вернуться к лучшим традициям нашего народа, к его вековым корням, к таким вечным понятиям, как род, родство, Родина. Поэтому сегодня снова очень остро стоит вопрос о формировании гражданственности и чувства патриотизма среди молодежи. В центре воспитательного воздействия на молодежь стоят такие проблемы как воспитание патриотизма, гражданственности, подлинной духовности,